IV. Центральный Комитет Партии Белорусских Федералистов находится в столице Белоруссии — г. Минске.

---

[1] Статут друкуецца на мове арыгінала.
[2] НА РБ ф. 62 воп. 1. спр. 109. арк. 21—23. Тэкст прадставіла Т. Л. Пухава.

В. М. БУСЬКО

## АДЛЮСТРАВАННЕ Ў ЭКАНАМІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ 20-х гг. ПОГЛЯДАЎ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАЎ НА РЫНАК

У літаратуры па палітэканоміі СНД зноў стала актуальнай тэма аб прыродзе сацыял-дэмакратыі, яе месцы і ролі ў развіцці грамадскай, у тым ліку эканамічнай думкі, што звязана з пераходам нашага грамадства ў новую якасць. У Рэспубліцы Беларусь узніклі партыі і плыні, абвясціўшыя сябе аднадумцамі сацыял-дэмакратычнай мадэлі грамадскага і эканамічнага развіцця.

Вось чаму значную цікавасць выклікае вывучэнне крытыкі сацыял-дэмакратыі ідэолагамі артадаксальнага марксізму, як называлі сябе камуністы. У 20-я гг. сацыял-дэмакратыя, з аднаго боку, канчаткова афармілася ў самастойную палітычную плынь, якая абрала сваёй мэтай паступовае ператварэнне капіталістычных вытворчых адносін у сацыялістычныя. З другога боку, гэтыя гады характарызаваліся буйнымі пераўтварэннямі ў свеце, выклікаными спробай СССР рэвалюцыйным шляхам, шляхам дыктатуры пралетарыяту з абмежаваным допускам рыначных адносін пабудаваць у краіне сацыялізм, і пераходам капіталізму ў дзяржаўна-манапалістычную стадыю развіцця.

Найбольш вядомымі тэарэтыкамі заходняй сацыял-дэмакратыі ў той час былі К. Каўцкі, Р. Гельфердзінг — у Германіі, О. Баўэр і М. Адлер — у Аўстрыі, а таксама рускія меншавікі і эсэры ў эміграцыі (У. Чарноў, Ю. Мартаў, Ф. Дан, Р. Абрамовіч), рупарам якіх быў часопіс «Сацыялістычны веснік».

Аналізам эканамічных поглядаў меншавікоў актыўна займаўся наркам працы БССР, затым рэдактар «Звязды» В. Нодэль[1]. Вывад яго быў адназначны: меншавізм выражае інтарэсы не рабочага класа, а ліберальнай буржуазіі. Свой вывад ён падмацоўваў адмовай Ю. Мартава, Ф. Дана і Р. Абрамовіча ад дыктатуры пралетарыяту, іх крытыкай эканамічнай палітыкі рускіх бальшавікоў. Па яго сцвярджэнню, меншавікі знаюць, што рабочыя не згодзяцца з іх прапановай перадаць прадпрыемствы ў прыватнае карыстанне, бо разумеюць, што за гэтым надыйдзе вяртанне да капіталізму і палітычнай улады буржуазіі. Вось чаму меншавікі і прапанавалі пралетарыяту захаваць у сваіх руках транспарт, ваенную прамысловасць, пошту, а ўсё астатняе перадаць прадпрымальнікам і кааператарам у арэнду або ў прыватнае карыстанне, не дазваляючы дзяржаўнага ўмяшання ў гаспадарчае жыццё прадпрыемстваў. Іншымі словамі, толькі рэгуляваны дзяржавай рынак, прадпрымальніцтва змогуць забяспечыць далейшае развіццё прадукцыйных сіл Расіі. Па словах В. Нодэля, выступаючы за развіццё рыначных адносін, меншавікі патрабуюць свабоды прыватнага гандлю, замены дзяржаўнай манаполіі ў эканоміцы дзяржаўным рэгуляваннем. Задавальненне гэтых патрабаванняў, лічыць В. Нодэль, паставіла б Расію ў кабальную залежнасць ад замежнага капіталу, ператварыўшы яе ў калонію еўрапейскіх дзяржаў, таму што айчынная прамысловасць у гэтых умовах будзе няздольнай канкурыраваць з замежным капіталам. «Праграма меншавікоў, — робіць вывад ён, — разлічана пераважна і выключна толькі на абарону інтарэсаў нэпманаўскай буржуазіі ў горадзе і кулакоў у вёсцы». Як бачым, аргументы супраць развіцця ў нас рынку, выстаўленыя зараз шэрагам яго апанентаў, не вызначаюцца навізной: распрадажа бацькаўшчыны, здрада інтарэсам рабочага класа.

Сацыял-дэмакратычную тэорыю канструктыўнага сацыялізму, атрымаўшую найбольш поўнае адлюстраванне ў работах Р. Гельфердзінга, даследаваў у свой час дацэнт БДУ І. Герчыкаў. Сваю крытыку ён будаваў на параўнанні праграмы Камуністычнага інтэрнацыянала і гэтай тэорыі. Розніцу ў пазіцыях камуністаў і сацыял-дэмакратаў бачыў ён у неадназначным разуменні сучаснага гістарычнага перыяду. На яго думку, сацыял-дэмакраты зыходзілі з магчымасці пераходу да сацыялізму без грамадзянскіх войнаў і сацыялістычных рэвалюцый, у межах буржуазнай дэмакратыі, ігнаруючы наяўнасць класавай барацьбы. Такое разуменне, лічыць І. Герчыкаў, — завуаліраваная абарона капіталізму і бернштэйніянства, што не патрабуе асобных доказаў, бо гэтая з'ява ўжо грунтоўна раскрытыкавана ў марксісцкай літаратуры.

Беларускі вучоны вытлумачыў гісторыю стварэння тэорыі канструктыўнага сацыялізму, пачатак якой паклалі працы англійскага сацыял-дэмакрата Р. Макдональда «Социализм критический и конструктивный» (1921) і лідэра рускіх эсэраў У. Чарнова «Конструктивный социализм» (1925). Зыходным пунктам тэарэтычных пошукаў гэтых аўтараў, лічыць ён, з'яўляецца адмаўленне навуковага сацыялізму К. Маркса і вяртанне да Г. Спенсера, М. Міхайлоўскага і іншых рускіх народнікаў.

Для доказаў таго, што У. Чарноў і Р. Макдональд пераказваюць погляды Р. Гельфердзінга, беларускі даследчык падрабязна аналізуе падыход апошняга да стварэння манаполій, якія знішчаюць свабодную канкурэнцыю і ствараюць прадпасылкі пераадолення анархіі вытворчасці. У такіх умовах, лічыць Р. Гельфердзінг, адбываецца паляпшэнне сацыяльнага становішча рабочага класа, што знаходзіць адлюстраванне ў памяншэнні беспрацоўя, увядзенні страхавання, павышэнні ролі прафсаюзаў у жыцці працоўных, тым самым капіталістычныя супярэчнасці пастулова, шляхам гаспадарчай дэмакратыі, ліквідуюцца — у гэтым і ёсць сутнасць канструктыўнага сацыялізму. Гэты эвалюцыйны шлях патрабуе, аднак, значнага адрэзку гістарычнага часу, на працягу якога капітал усё больш падпарадкоўваецца дэмакратычнаму кантролю з боку рабочага класа, гэта значыць, шлях да сацыялізму ляжыць, заключаў Р. Гельфердзінг, праз стварэнне дэмакратычнай дзяржавы і ўзмацненне планавага вядзення гаспадаркі.

І. Герчыкаў крытыкаваў падобныя разважанні, спасылаючыся на тое, што і пры імперыялізме галоўнае для капіталіста — прыбытак, сістэма ж манаполій не ліквідуе канкурэнцыі, наадварот, узнаўляе яе ў пашыраным маштабе. Ён прывёў даныя па Германіі, згодна якіх доля дзяржаўных прадпрыемстваў у прамысловасці хоць і ўзрасла з 1/12 да 1/5, але гэтыя прадпрыемствы знаходзяцца ў прыватнакапіталістычным падпарадкаванні, бо прадстаўнікі дзяржаўнай улады адначасова з'яўляюцца членамі саветаў як першых, так і другіх тыпаў прадпрыемстваў.

Погляды Р. Гельфердзінга І. Герчыкаў лічыў блізкімі ліберальнаму напрамку буржуазнай эканамічнай думкі, прадстаўленай Д. Кейнсам, які на месца індывідуальнай волі і свабоднай канкурэнцыі ставіў карпаратыўна регуляваную вытворчасць. Паколькі дзяржава пастулова сацыялізіруе прыватныя прадпрыемствы, то і ідэі сацыялізму, па Д. Кейнсу, сыходзяць на нішто. Розніцу паміж Р. Гельфердзінгам і Д. Кейнсам беларускі вучоны бачыць у тым, што калі першы не спрабаваў адкрыта пахаваць сацыялізм, то другі безапеляцыйна заяўляе аб гэтым.

І. Герчыкаў бачыў ахавальны характар тэорыі канструктыўнага сацыялізму ў апалогіі капіталізму, у яго аптымізме ў сувязі з яго будучым пад'ёмам. Але ў той жа час беларускі крытык пагадзіўся з вывадамі М. Бухарына і Я. Варгі, якія лічылі, што значныя поспехі сучаснага капіталізму не могуць пазбавіць яго супярэчнасцей. Ацэнка канструктыўнага сацыялізму І. Герчыкавым зводзілася да наступнага: «Сутнасць канструктыўнага сацыялізму і заключаецца ў апалогіі капіталізму, у ацэнцы яго як прагрэсіўна дзеючага гістарычнага фактару, як эпохі росквіту, а не дэградацыі капіталізму»[2].

Паколькі сельская гаспадарка ў той час была вядучай галіной Беларусі, а аграрныя праблемы з'яўляліся прадметам дыскусій, то ў эканамічнай літаратуры асобая ўвага ўздзялялася рашэнню гэтых пытанняў тэарэтыкамі заходняй сацыял-дэмакратыі. Крытычны аналіз надрукаваных у 20-я гг. аграрнай праграмы аўстрамарксістаў і кнігі О. Баўэра «Борьба за землю» даў беларускі эканаміст Ш. Гольдзін[3]. Галоўным недахопам аўстрамарксістаў ён лічыць адказ ад тэорыі класавай барацьбы, накіраванасць на развіццё прадукцыйных сіл у вёсцы без уліку асаблівасцей буйных капіталістычных і сялянскіх гаспадарак.

Пункты праграмы, прысвечаныя праблемам пад'ёму культуры ў вёсцы, кааперацыі як сродку абароны ад прыватнага гандлёвага капіталу, пераходу асабістых гаспадарак на калектыўны пачатак, рэгуляванне рабочага дня, Ш. Голдзін лічыў рэфармісцкімі, бо яны вырашаюцца ў рамках захавання капіталізму. Беларускі крытык галоўны недахоп ідэі сацыялізацыі бачыў у адсутнасці ў ёй механізма рэалізацыі. Падазрона, гаварыў ён, што буржуазны ўрад пачне праводзіць яе ў жыццё, паколькі гэта супярэчыць прыродзе капіталізму. У ідэі сацыялізацыі О. Баўэра ён таксама не ўбачыў важнага прынцыпу: з выкупам альбо без выкупу будзе сацыялізіравацца буйное землеўладанне. Акрамя таго, Ш. Гольдзін сумняваўся ў правільнасці вывадаў О. Баэўра аб неабходнасці папярэдняй падрыхтоўкі селяніна да работы ва ўмовах буйной гаспадаркі. На яго думку, падрыхтоўка сацыялістычных кадраў можа ажыццяўляцца толькі на базе сацыялістычнай вытворчасці.

Няправільна разглядаць і прапанаваную аўстрамарксістамі нацыяналізацыю зямлі як сацыялістычную. Абапіраючыся на аргументы К. Маркса, У. Леніна і

К. Каўцкага, Ш. Гольдзін даказвае, што гэтая мера з'яўляецца капіталістычнай, бо вызваляе толькі сельскую гаспадарку ад феадальных путаў, якія стрымліваюць развіццё прадукцыйных сіл вёскі. Сваю пазіцыю ён тлумачыў, зыходзячы з разумення таварнай вытворчасці, якая параджае капіталізм і ў сельскай гаспадарцы. «Дзе ёсць рынак, — піша Ш. Гольдзін, — там заўсёды ёсць падставы для развіцця капіталізму, канкурэнцыя таваравытворцаў на рынку немінуча прыводзіць да перамогі адных і паражэння другіх». Другімі словамі, крытык прыходзіць да думкі, што пры любым рынку, сацыялізму не можа быць, бо рынак вядзе да расслаення насельніцтва. Менавіта з такой пазіцыі ён разглядае і кааперацыю пры капіталізме, якую нельга расцэньваць як шлях да сацыялізму, пакуль у вытворчасці маюць месца капіталістычныя адносіны. Вось чаму баўэраўскі пераходны перыяд да сацыялізму нічога агульнага з сацыялізмам не мае. Вывад беларускага крытыка быў адназначным: аўстрамарксізм здае пазіцыі рэвізіянізму і ператвараецца ў дробнабуржуазны рэфармізм. Гэтай думкай ён як бы пацвердзіў адмоўныя адносіны кіраўніцтва ВКП(б) да выкарыстання рыначных адносін для эвалюцыйнага пераходу савецкай эканомікі ў сацыялізм, бо меры, якія прапанаваў О. Баўэр, у гады НЭПа ужываліся і ў савецкай, у тым ліку беларускай вёсцы: рынак, кааперацыя, крэдыт, налогі і ўсё да т. п.

Разглядаючы вытокі рэвізіянізму германскай сацыял-дэмакратыі, беларускі гісторык Я. Рыўлін сцвярджаў, што заснавальнікам рэвізіянізму з'яўляецца не Э. Бернштэйн, а Г. Фольмар, дэпутат рэйхстага і кіраўнік баварскай партыйнай арганізацыі ў 90-я гг. XIX ст[4]. На думку Я. Рыўліна, менавіта Фольмар прапанаваў ідэю неабходнасці класавага пагаднення пралетарыяту з буржуазіяй, што вынікае з неразумення сацыял-дэмакратамі класавай сутнасці буржуазнай дзяржавы, таму што да таго часу, пакуль пралетарыят не возьме ўладу, дзяржава будзе сродкам падаўлення эксплуатуемых класаў. Кожная рэформа, сцвярджаў Г. Фольмар, з'яўляецца крокам да сацыялізму, вось чаму ён, па Я. Рыўліну, і падтрымліваў буржуазную ідэю аб дзяржаўным сацыялізме, аб неабходнасці супрацоўніцтва сацыял-дэмакратыі з буржуазнай дзяржавай. Адгэтуль, разважаў беларускі гісторык, галоўным пунктам праграмы германскіх сацыял-дэмакратаў стала не барацьба за сацыялізм, а за стварэнне ўмоў для правядзення рэформ, выключаючы тым самым неабходнасць рэвалюцыйнага захопу улады пралетарыятам. Далейшае скочванне на пазіцыі рэвізіянізму зрабіла з Г. Фольмара рупар дробнабуржуазнай ідэялогіі такога прамежкавага пласта буржуазнага грамадства, як сялянства. Такім чынам, беларускі крытык ускосна салідарызаваўся са сцвярджэннем шэрагу бальшавіцкіх лідэраў аб кантрэвалюцыйнасці сялянства.

Я. Рыўлін спрабаваў выявіць сацыяльныя пласты, на якія ў першую чаргу абапіралася германская сацыял-дэмакратыя. На падставе аналізу вынікаў галасавання на адным са з'ездаў Германскай сацыял-дэмакратычнай партыі ён прыйшоў да высновы, што за праграму Г. Фольмара галасавалі дэлегаты ад паўднёвай Германіі, дзе ў той час пераважала сельскае насельніцтва. Вось чаму Я. Рыўлін пагадзіўся з вывадамі Паннекука і У. І. Леніна аб тым, што з'яўленне апартунізму ў рабочым руху — вынік нераўнамернага развіцця капіталізму ў асобных рэгіёнах, у краінах з адсталай прамысловасцю, панаваннем дробнабуржуазных элементаў з неразвітай класавай барацьбой.

Такім чынам, у эканамічнай думцы Беларусі 20-х гг. меў месца тэзіс аб неадпаведнасці рынка і сацыялізму, бо рынак параджае капіталізм, магчымасці якога ў развіцці прадукцыйных сіл вычарпаны. Беларускія эканамісты недаацэньвалі таксама тэндэнцыю, якая намецілася ў развіцці дэмакратычнага пачатку кіравання капіталістычнай вытворчасцю, абвінавачваючы заходнееўрапейскіх сацыял-дэмакратаў, станоўча ацаніўшых гэтую з'яву, у рэвізіянізме.

[1] Гл.: Н о д э л ь В. // Полымя. 1923. № 2; Ён жа // Звязда. 1924. № 157.
[2] Г е р ч и к о в И. В. Конструктивный социализм. Мн., 1928. С. 20.
[3] Гл.: Г о л ь д з і н Ш. // Большевик Белоруссии. 1929. № 6.
[4] Гл.: Р и в л и н Е. // Под Знаменем Марксизма. 1926. № 11; Ён жа. Аграрная дискуссия в Германской социал-демократии. Мн., 1929.